**Адраджэнне этнакультурных традыцый Аршаншчыны ў адукацыйным працэсе ўзорнага фальклорнага калектыву ”Сявенька“**

*Шчэрбава Вольга Міхайлаўна, настаўніца музыкі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, кіраўнік узорнага фальклорнага калектыву ”Сявенька“ Дзяржаўнай установы адукацыі ”Сярэдняя школа № 15 г.Барані“, Рыжыкава Марыя Мікалаеўна, настаўніца музыкі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, канцэртмайстар узорнага фальклорнага калектыву ”Сявенька“ Дзяржаўнай установы адукацыі ”Сярэдняя школа № 15 г.Барані“*

Дзіцячы фальклор з’яўляецца ”азбукай“ нацыянальнай музычнай мовы, тым універсальным матэрыялам, які адказвае патрабаванням мастацкасці і даступнасці. Усе яго жанры і віды, пачынаючы ад казак і песен-калыханак і канчаючы народнай музыкай і танцамі, багата насычаны жыццёвым зместам. У працэсе далучэння навучэнцаў да нацыянальнага музычнага фальклору фарміруюцца не толькі агульныя першапачатковыя ўяўленні аб нацыянальнай музычнай культуры, жыцці і традыцыях беларускага народа, але і складаецца слоўнік найбольш характэрных для нацыянальнай культуры музычных інтанацый, своеасаблівых музычных ”эталонаў“ нацыянальнай музычнай мовы. Фальклор прапануе ўзоры, якія могуць стаць для дзяцей своеасаблівай школай засваення агульных  музычных заканамернасцей, школай развіцця музычнага мыслення і слыхавых здольнасцей. І яшчэ фальклор мае некаторую перавагу перад іншым музычным рэпертуарам у тым, што кожны яго твор ужо першапачаткова, дзякуючы яго сінкрэтычнай прыродзе, мае патэнцыяльную магчымасць для ўключэння аднаго твора адразу ў некалькі відаў дзіцячай дзейнасці.

Звяртанне да народных абрадаў і святаў, народна-песеннай творчасці садзейнічае фарміраванню ў вучняў культурнай ідэнтычнасці, разуменню таго, што яны з’яўляюцца часткай асобнай культуры. Важным момантам уяўляе сабой знаёмства навучэнцаў з вытокамі тых, ці іншых музычных з’яў, традыцыямі і звычаямі беларускага народа.

Прыемна, што гэтыя традыцыі знаходзяць адлюстраванне ў дзейнасці сучасных фальклорных калектываў, якім з’яўляецца ўзорны фальклорны калектыў ”Сявенька“. Калектыў існуе амаль 30 гадоў. А пачыналася ўсё значна раней, калі аднойчы з расповедаў і напеваў дырэктара школы Валетавай Веры Ільінічны, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Нагорная Тамара Іванаўна са сваімі вучнямі падрыхтавалі свята ”Вяселле“, а калектыў назвалі ”Весялуха“. Так два апантаных кіраўнікі стварылі аснову дзеля дальнейшага існавання цяперашняга калектыву ”Сявенька“, які беражліва захоўвае традыцыі рэгіянальнага фальклору і яго каларыт, з’яўляецца захавальнікам і носьбітам народных традыцый Аршаншчыны,

адраджае старадаўнія абрады, песні, танцы сваёй мясцовасці, якія шмат год жылі толькі ў памяці жыхароў навакольных вёсак. Мастацтва фальклору нараджаецца і існуе сярод саміх творцаў і выканаўцаў, таму важным момантам далучэння да народнага мастацтва з'яўляецца знаёмства з носьбітамі традыцыйнай культуры і вывучэнне традыцый свайго рэгіёну. У школе ёсць багатая аўдыё і відэятэка разнажанравага матэрыялу, запісаннага ў Аршанскім раёне, таму мы лічым вельмі важным перадаць гэтае багацце новым пакаленням нашых навучэнцаў.

З цягам часу, калі ў школе быў арганізаваны эстэтычны накірунак, калектыў пачаў працаваць на прафесійным узроўні. Было вырашана змяніць назву калектыва, бо мы не толькі весялілі сваёй творчасцю гледачоў, але, як казалі нашы продкі ў мінулым – ”бяры сявеньку ды сей па-маленьку“, збіраючы, вывучаючы і паказваючы святы і абрады, рассявалі і рассяваем народную мудрасць, каштоўнасць, традыцыю ў спевах, танцах, вусна-паэтычнай творчасці сярод шырокага кола гледачоў розных узроставых катэгорый. Так мы сталі звацца ”Сявенька“. З 2004 года калектыў мае званне ”узорны“.

Мэта дзейнасці: далучэнне школьнікаў да вывучэння, распаўсюджвання і папулярызацыі беларускага традыцыйнага фальклора, у тым ліку Аршанскага рэгіёна.

Задачы:

- знайсці носьбітаў фальклорных традыцый;
- запіс фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў;
- пераняць абрадавы фальклор, звычаі сваёй мясцовасці;
- папулярызаваць беларускі традыцыйны фальклор.

Асноўная дзейнасць калектыва – гэта абрадавы фальклор. А дакладна – збіранне, вывучэнне, пераймание ад носьбітаў фальклору спосабаў выканання мясцовага песеннага, вусна-паэтычнага і іншага фальклорнага матэрыялу ў абрадавых пастаноўках. Так былі адноўлены святы ”Вялікдзень“, ”Гуканне вясны“, ”Юр'я“, ”Піліпаўскія вячоркі“, ”Каляды“, ”Масленіца“, ”Купалле“, ”Жніво“, ”Кірмаш“.

Чаму калектыў займаецца менавіта абрадамі? Таму што ў абрадзе можна раскрыць жыццё народа, характар беларуса як гаспадара, працаўніка, яго адносіны да зямлі, да працы, да Бога, да жыцця, паказаць уласцівыя яму рысы характару – непамерную дабрату, добразычлівасць, гасціннасць, яскравае пачуццё гумару. Дзеці падчас стварэння менавіта абрадаў могуць не толькі спяваць, танчыць, іграць на розных інструментах, але і праяўляць артыстычныя здольнасці, актыўна ўдзельнічаць у стварэнні вобразаў сваіх продкаў у розных жыццёвых абставінах, у свеце і ў працы.

Падчас вандровак па Аршанкім раёне ў вёсцы Клюшнікава ад Франковай Вольгі Сцяпанаўны 1927 г.н. мы пачулі расповед пра святкаванне ”Вялікадня“: як хадзілі па дварах валачобнікі, якую вялі гутарку з гаспадарамі, якія песні спявалі і інш. Так мы запісалі песні ”Із-за лесу, лесу цёмнага“, ”Ды была ў бабкі курка-рабурка“, ”Свяці, свяці, сонейка“. Унук Вольгі Сцяпанаўны пазнаёміў са сваімі любімымі загадкамі, лічылкамі,

навучыў нас гуляць у гульні ”Пакаці яечка“ і ”Коршун і піскляты“. Потым у вёсцы Згарды ад Цітовай Марыі Віктараўны 1923 г.н. мы запісалі песні ”А ў гародпічку на прасотнічку“, ”А з-за лесу цёмнага“, цікавыя прыкметы. Так валачобны абрад і ўвесь вусны матэрыял быў выкарыстаны ў нашай пастаноўцы свята ”Вялікдзень“.

Сцэнарый свята ”Хрэсьбіны“ створаны ў нашым калектыве таксама па запісах ад носьбітаў. Зразумела, што галоўнымі ўдзельнікамі гэтай пастаноўкі з’яўляюцца старэйшыя вучні, але ў ёй ёсць абрад ”Бабіна каша“, калі малодшыя ўдзельнікі выносяць кашу, якую прыгатавала бабка-павітуха. Эпізод уключае ў сябе і песню, і танец, і жартоўныя забаўлянкі. У такіх суадносінах ажыццяўляецца перадача вопыту ад старэйшых удзельнікаў калектыву малодшым.

У нашым калектыве з пачатку існавання і па сёняшні дзень існуе асаблівая душэўная атмасфера, якая, акрамя творчасці, таксама прыцягвае ўдзельнікаў. Нават, пасля заканчэння школы, выпускнікі працягваюць сваю творчасць у розных мастацкіх калектывах і прыязджаючы ў родны горад, спяшаюцца ў школу да сваёй ”Сявенькі“. Адзін з іх – вучань школы і саліст нашага калектыву Яраслаў Еўтушэўскі, які ўжо скончыў універсітэт і з’яуляецца настаўнікам гісторыі, але і падчас вучобы, і зараз спявае народныя песні ў народным калектыве, а прыходзячы да нас, распавядае розныя цікавыя гісторыі пра свой удзел у конкурсах, знаёміць з новымі песнямі і спявае разам з намі.

Культурнае жыццё калектыву насычанае і разнастайнае. Узорны фальклорны калектыў ”Сявенька“ актыўна прапагандуе традыцыі свайго краю, выступае перад рознымі катэгорыямі насельніцтва не толькі ў Аршанскім раёне, але і ў іншых. Падчас такога доўгага існавання калектыў удзельнічаў у конкурсах і фестывалях рознага ўзроўню, займаючы першыя і прызавыя месцы. Сярод іх: штогадовы раённы фестываль ”Буду Зоркай“, абласныя фестывалі ”Ад прашчураў да зор“ (г.Віцебск і г.п.Расоны), абласны этап Рэспубліканскага смотра-конкурса ”Здравствуй, мир!“ (г.Віцебск), Рэспубліканскі конкурс ”Юныя таленты Беларусі“ (Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр ”Зубраня“, г.Мінск), Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі ”Дажынкі“ (г.Орша), абласное свята ”Дажынкі“ (г.Шуміліна). Вельмі ўразіў удзельнікаў калектыву нядаўні ўдзел у абласным конкурсе дзіцячай творчасці ”Карагод зямлі Беларускай“, па выніках якога мы атрымалі Дыплом I ступені і прынялі ўдзел у цудоўным свяце дзіцячага фальклору ў дзень адкрыцця міжнароднага фестывалю ”Славянскі базар у Віцебску“.

Такім чынам, выкарыстанне разнастайных формаў і метадаў этнапедагогікі садзейнічае фарміраванню гарманічнай асобы і вырашае задачы эстэтычнага, духоўнага і патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Родная мова, якую засвойваюць школьнікі падчас вывучэння фальклору, з’яўляецца тым падмуркам, на якім вырастае потым пачуццё любові да свайго краю.

Збіраецца, вывучаецца, захоўваецца, перадаецца і, разам з тым,аднаўляецца ў сучасных умовах багатая духоўная спадчына нашых продкаў. Дзякуючы гэтаму ажыццяўляецца гістарычная сувязь паміж пакаленнямі, якая сцвярджае, што народная мудрасць – вялікая эстэтычная каштоўнасць, у якой шмат чаго сугучна з нашымі поглядамі і пачуццямі.

Кожны ўдзельнік узорнага фальклорнага калектыву ”Сявенька“ адчувае асабістае дачыненне да высакароднай справы і гонар за адраджэнне і захаванне народных традыцый, абрадаў і песень Аршанскага раёна.